ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.11.2024 № 487

# Білеты
для правядзення выпускнога экзамену і экзамену ў парадку экстэрнату
пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі
па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі»

2024/2025 навучальны год

Білет № 1

1. Асаблівасці старажытных цывілізацый: узнікненне першых лакальных цывілізацый у свеце. Рабства ў старажытных цывілізацыях. Асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі Старажытнага Усходу. Гарады-дзяржавы і старажытныя імперыі.

2. Беларусь на шляху да індустрыяльнага грамадства: асаблівасці пераходу ад ручной працы да машыннай вытворчасці. Буржуазныя рэформы. Развіццё капіталістычных адносін у прамысловасці. Развіццё транспарту і гандлю, урбанізацыя.

Білет № 2

1. Вялікая славянская міграцыя і Беларусь: праблема паходжання славян. Рассяленне славян. Шляхі міграцыі славян ва Усходняй Еўропе. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі.

2. Крызіс традыцыйнага грамадства ў краінах Усходу: Індыя пад уладай англічан. Ператварэнне Кітая, Ірана і Асманскай імперыі ў паўкалоніі. Японскі досвед мадэрнізацыі. Краіны Усходу ў эпоху «абуджэння Азіі».

Білет № 3

1. Дзяржавы Ранняга і Высокага сярэднявечча ў Еўропе: Вялікае перасяленне народаў. Новая палітычная карта. Візантыйская імперыя і яе ўплыў на славянскія народы. Асаблівасці еўрапейскіх дзяржаў Ранняга і Высокага сярэднявечча.

2. Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Змяненне сацыяльнай структуры беларускага грамадства. Становішча сялян і працоўных. Працоўныя міграцыі. Перасяленчы рух.

Білет № 4

1. Старажытная Русь – дзяржава ўсходніх славян: утварэнне Старажытнарускай дзяржавы. Беларускія землі ў Старажытнарускай дзяржаве. Княжацкая ўлада. Палітыка першых усходнеславянскіх князёў. Росквіт Старажытнай Русі. Палітычная раздробненасць Старажытнай Русі, яе прычыны і наступствы.

2. Беларускае грамадства ў пачатку XX ст. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі. Міграцыя насельніцтва. Сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва. Адукацыйны ўзровень насельніцтва. Фарміраванне інтэлектуальнай эліты і станаўленне нацыянальнай самасвядомасці.

Білет № 5

1. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі: утварэнне Полацкага княства. Дзейнасць полацкіх князёў па ўмацаванні дзяржавы. Тураўскае

княства. Асаблівасці становішча Гарадзенскага княства.

2. Беларусь у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях. Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі. Уплыў рэвалюцыі на ўздым беларускага нацыянальнага руху. Кастрычніцкая рэвалюцыя на тэрыторыі Беларусі. Барацьба за стварэнне беларускай дзяржавы.

Білет № 6

1. Грамадства і эканоміка беларускіх зямель у IX–XIII стст.: структура грамадства. Роля абшчыны. Асаблівасці развіцця гаспадаркі. Развіццё рамёстваў. Шляхі ўзнікнення і функцыі старажытных гарадоў Беларусі. Характар і змест гандлю.

2. Краіны Захаду ў міжваенны перыяд: асноўныя этапы эканамічнага развіцця. Сацыяльныя і палітычныя перамены. Сусветны эканамічны крызіс і яго наступствы.

Білет № 7

1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага: прычыны ўтварэння новай дзяржавы. Шляхі ўваходжання ўсходнеславянскіх земляў у новую дзяржаву. Дзейнасць вялікіх князёў па фарміраванні тэрыторыі дзяржавы.

2. Заходняя Беларусь у 1921 – 1939 гг.: Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. Тэрыторыя, насельніцтва. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад. Паланізацыя насельніцтва. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і працоўны рух.

Білет № 8

1. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявеччы: стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў у Заходняй Еўропе. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў. Візантыя ў перыяд Позняга сярэднявечча. Асаблівасці ўтварэння расійскай дзяржаўнасці. Усходнія дэспатыі.

2. Дасягненні культуры Беларусі ў 1920 – 1930-я гг.: адукацыя, станаўленне навукі. Дасягненні ў развіцці беларускай мовы і літаратуры, драматургіі, тэатра і кіно. Сродкі масавай інфармацыі (СМІ). Традыцыйная культура. Тэндэнцыі ў развіцці мастацтва.

Білет № 9

1.Развіццё феадальных адносін у ВКЛ: пазямельныя адносіны ў ВКЛ. Саслоўі феадальнага грамадства: правы, абавязкі і прывілеі. Шляхі фарміравання залежнага сялянства. Пачатак запрыгоньвання сялян на тэрыторыі Беларусі.

2. Міжнароднае становішча напярэдадні і на пачатку Другой Сусветнай вайны: агрэсіўная палітыка Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я

гады. Палітыка прымірэння агрэсара. Мюнхенскі дагавор і яго роля ў развязванні вайны. Дзейнасць СССР у кантэксце геапалітычнай сітуацыі ў свеце. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

Білет № 10

1. Культура Беларусі ў другой палове XIII–XV ст.: Характар культурных працэсаў у ВКЛ. Культавае і абарончае дойлідства. Літаратура. Забавы і святы.

2. Вялікая Айчынная вайна: планы нацысцкай Германіі адносна СССР. Характар вайны. Франты Вялікай Айчыннай. Партызанскі і падпольны рух. Кошт і крыніцы Перамогі.

Білет № 11

1. Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў: Вялікія геаграфічныя адкрыцці і пачатак еўрапейскага каланіялізму. Стварэнне Іспанскай і Партугальскай каланіяльных імперый. Каланіяльная экспансія Англіі і Францыі. Асноўныя наступствы еўрапейскага каланіялізму.

2. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі і палітыка генацыду мясцовага насельніцтва ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Генацыд беларускага народа.

Білет № 12

1. Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст.: статуты ВКЛ 1529, 1566 гг. Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Барацьба ВКЛ за самастойнасць. Статут ВКЛ 1588 г. Прычыны ўнутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. Спробы рэформ. Падзелы Рэчы Паспалітай.

2.Масавая барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Рух Супраціўлення ў Еўропе.

Білет № 13

1. Гуманізм і Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі: асаблівасці эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, асветнік, філосаф і гуманіст. Паслядоўнікі Францыска Скарыны. Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.

2. Улада і грамадства ў гады Вялікай Айчыннай вайны: арганізацыя ўлады і кіраванне грамадствам. Добраахвотная самамабілізацыя грамадства. Рэлігійная палітыка Савецкай дзяржавы. Вытокі духоўнай стойкасці савецкага народа.

Білет № 14

1. Эпоха Асветніцтва: сутнасць і асноўныя ідэі Асветніцтва. Асаблівасці Асветніцтва ў асобных еўрапейскіх краінах. Асаблівасці

палітыкі «асветніцкага абсалютызму». Эпоха Асветніцтва ў Расіі.

2. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР): сутнасць і наступствы. Постіндустрыяльнае грамадства. Інфармацыйная рэвалюцыя як складнік НТР і яе ўплыў на развіццё грамадства.

Білет № 15

1. Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя ў ВКЛ: канфесійная сітуацыя у пачатку XVI ст. Асаблівасці і напрамкі Рэфармацыі ў ВКЛ. Контррэфармацыя.

2. СССР у 1945 – 1991 гг.: асноўныя этапы развіцця савецкай дзяржавы. Палітычная сістэма. Сацыяльна-эканамічная сістэма. Спробы ліберальнага рэфармавання і іх вынікі. Распад СССР.

Білет № 16

1. Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу: Лівонская вайна. Ваенныя канфлікты Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у XVII ст. Казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі. Паўночная вайна і яе наступствы для Беларусі.

2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг.: структура эканомікі БССР. Эканамічныя рэформы і іх вынікі.

Білет № 17

1. Напалеонаўскія войны і Беларусь: напалеонаўскія войны, іх прычыны і характар. Перамены ў Еўропе. Айчынная вайна 1812 г. і яе наступствы для Беларусі.

2. Краіны Захаду ў другой палове XX – першай чвэрці XXI стст.: паняцце «заходні свет». «Дзяржава ўсеагульнага дабрабыту» і яе крызіс. Еўраінтэграцыя: дасягненні і праблемы.

Білет № 18

1. Прамысловая рэвалюцыя: сутнасць і асноўныя этапы. Роля навукі ў развіцці прамысловасці. Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі.

2. Культура ў БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг.: развіццё адукацыі. Найважнейшыя навуковыя і культурныя дасягненні. Праблемы ў галіне развіцця навукі, літаратуры і мастацтва.

Білет № 19

1. Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці правядзення аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Беларусі, вынікі і наступствы.

2. Палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг.: палітычная сістэма ў БССР. Умацаванне беларускай дзяржаўнасці. Дзейнасць Саветаў і грамадскіх арганізацый.

Білет № 20

1. Нацыянальныя рухі ў XIX ст. у Беларусі: прычыны, мэты, характар, плыні, вынікі і наступствы.

2. Грамадска-палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь: трансфармацыя і асноўныя кірункі развіцця палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Асаблівасці яе функцыянавання.

Білет № 21

1. Культура Беларусі XIX – пачатку XX ст.: станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Адукацыя і навука. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці мастацтва.

2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь: беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Стратэгічныя напрамкі развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь.

Білет № 22

1. Расія ў 1917 г.: Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі: Лютаўская рэвалюцыя. Падзенне манархіі. Двоеўладдзе. Кастрычніцкая рэвалюцыя і яе характар. Значэнне і наступствы Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый.

2. Рэспубліка Беларусь у свеце: геапалітычнае становішча Беларусі. Удзел Беларусі ў інтэграцыйных працэсах (Саюзная дзяржава, СНД, ЕАЭС, АДКБ, ШАС). Дзейнасць Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях.

Білет № 23

1. Першая сусветная вайна як рубежны перыяд сусветнай гісторыі: прычыны, характар вайны. Асноўныя ўдзельнікі і іх мэты. Найважнейшыя падзеі вайны. Геапалітычныя наступствы Першай сусветнай вайны.

2. Культурныя працэсы ў сучаснай Беларусі: дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне культуры. Прыярытэтныя напрамкі развіцця адукацыі і навукі. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Білет № 24

1. Ад беларускай народнасці да беларускай нацыі: паняцце «нацыя», умовы фарміравання беларускай нацыі. Развіццё навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе.

2. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі: асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР.

Білет № 25

1. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны: становішча насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Ваенныя бітвы на тэрыторыі Беларусі. Брэсцкая мірная дамова. Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі.

2. Сучаснае беларускае грамадства: міжнацыянальныя адносіны, канфесійная палітыка дзяржавы, узровень жыцця, каштоўнасныя арыентацыі. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь.